Коштуе 2 руб.

Пралетарыі усіх краёў, злучайцеся!

# Савецкая Беларусь

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Менск, Літэрацка-выдавецкі аддзел Палітычнага ўпраўленьня Заходняга хронту.

Выданьне Рэўкому Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі.

№ 18 (28). Субота, 4-га верасьня 1920 г.

**Сягоньня апошні дзень „Тыдню раненага і хворага чырвонаармейца“. Не забывайце, грамадзяне, выпаўніць свой доўг—памагчы Чырвоным гэроям.**

## Менск—Рыга.

Капрызы, увёрткі, зацягіваньне перагавораў з боку яснавяльможнай шляхты, урэшці, рад чыста тэхнічных перашкод, якія давалі магчымасьць панам ухіляцца ад простага атказу, апіраючыся на кепскую работу тэлеграфу і тэлефону,—усё гэта прымусіла нашага Народнага Камісара заграцічных спраў прапанаваць палякам перанесьці перагаворы з прыхронтавай паласы ў нэйтральнае месца.

І вось цяпер менскі пэрыод перагавораў закончыўся, і з сталіцы Беларусі Менску перагаворы перанесены будуць у сталіцу Латышскай рэспублікі Рыгу.

Наша справа, справа працоўных Савецкіх рэспублік, зроблена добра: мы заявілі панам аб нашых адносінах да іх грабежніцкага навалу на Украіну і Беларусь, мы апавясьцілі ім нашые справядлівые і выгадные для працоўнага люду абодвух краёў умовы міру, мы сказалі ім, што мы толькі абараняемся. Нарэшце, мы назвалі публічна палякам нашага ворага—Францыю, пад кіраваньнем і дапамогай каторай белапалякі началі з намі крывавую братэрскую бойню.

Мы чэстна работалі ў Менску.

Не тое было з панамі. Яны ўхіляліся ад простага атказу, яны зацягівалі перагаворы, яны чакалі, калі палепшыцца іхнае становішча на хронце. Яны спачатку аткінулі нашые мірные ўмовы, а калі мы прыгразілі перарваць перагаворы, яны згодзіліся разглядаць нашые ўмовы, але дзеля гэтага іхнаму галаве Домбскаму трэба было параіцца з сваімі міністрамі—Дашынскім і Сапегай.

У Менску прашлі пяць пасяджэньняў мірнай нарады. На шостым пасяджэньні ў Рызе яны павінны будуць даць свой атказ, і яны яго дадуць, калі ня хочуць разрыву і калі ім сапраўды патрэбен мір.

А пакуль што льецца кроў працоўнага люду на хронтах. Але кожная лішняя кропля крыві чырвонаармейца дабліжае нас да астатачнай перамогі, кожная кропля крыві польскага рабочага, або селяніна, пойдзе на вашу галаву, паны памешчыкі і капіталісты.

Вы, паны, баіцёся ўтварыць з намі мір, дык асьцерагайцеся, каб польскіе працоўные грамады, каторым нарэшце надаесьць вечны ваш абман, ня спынілі ваша ўладарства. Мы хутка згаворымся з працоўнай Савецкай Польшчай, каторая не за гарамі і каторая спадзе вам, паны, як сьнег на галаву.

В. Ахрамовіч.

## Абарона Савецкіх Рэспублік.

*(Весткі з хронту, атрыманные ад Палявога Штабу Рэвалюцыйнага Ваеннага Савету Рэспублікі за 2-е верасьня).*

### Заходні хронт.

У Бярэсьціцкай ваколіцы, у 20—40 вярстах на поўнач ад Бярэсьця, мы занялі рад сяленьняў; паўдзёньней мы падышлі да самага гораду.

29 жніўня мы занялі Замосьце.

### Паўдзенна-Заходні хронт.

У Львоўскай ваколіцы нашы часьці затрымліваюць націск праціўніка, перайшоўшага ў наступ.

У Бучачскай ваколіцы мы аткінулі праціўніка на правы бераг Дністра.

### Паўдзенны хронт.

На Крымскім вучастку бойкі з пераменнай удачай трываюць так жа ўпарта.

*За Ваеннага Камісара Штабу Рэвалюцыйнага Ваеннага Совету* Васільеў.

## Паміжнародная таварыскасьць рабочых.

### Ня трэба вайны.

Паміжнародны саюз прафэсыянальных саюзаў Галяндыі апублікаваў адозву супроціў вайны, у якой патрабуе поўнага спыненьня ўсякіх контр-рэвалюцыйных выступаў супроціў Расеі, заручэньня, што яны ня будуць ужывацца болей. „Вайну патрэбна мінуць ва што б там ні было“. „Усе арганізацыі павінны прыняць супроціў гэтага патрэбные меры, хоць бы трэба было аб'явіць агульчую забастоўку“.

---

### Падтрыманьне ангельскіх рабочых.

*„Саветам Чыннасьцяў“ у Лёндане выпушчана адозва, якая патрабуе хуткай учыніць мірные перагаворы паміж Англіяй і Расеяй, ураз жа кінуць усякае падтрыманьне Польшчы, адазваць усе ангельскіе караблі з расейскіх мораў. „Савет Чыннасьцяў“ заве арганізаваных рабочых быць гатовыми да ўсякіх выпадкаў.*

---

### Патрабуюць міру.

Фінляндзкіе прафэсыянальные саюзы арганізавалі у Гэльсінгфорсе, Свэабаргу і другіх гарадох вялікіе маніхвэстацыі рабочых з мэтаю дасяганьня скарэйшага міру паміж Фінляндыяй і Савецкай Расеяй. Дэманстранты так сама патрабавалі аспабаненьня палітычных.

---

### Французкіе рабочые за нас.

У Французкіх прыбярэжных гарадох рабочые і матросы адмаўляюцца грузіць караблі з амуніцыяй для Польшчы. Парыжскіе рабочые выпусьцілі адозву, у якой клічуць працоўных адмаўляцца працаваць разам з душыцелямі расейскай рэвалюцыі.

